Гігін, В. Ф. Парадоксы рэвалюцыі: што адбылося ў Оршы і Сянно ў жніўні 1918 года? / В. Гігін // Беларуская думка. – 2015. – № 11. – С. 106–113.

## У віры дзвюх рэвалюцый

Што адбылося ў Оршы і Сянно ў жніўні 1918 года?

Паводле ўстойлівага стэрэатыпу, бальшавікі, захапіўшы ўладу ў кастрычніку 1917 года, адразу пачалі стварэнне дзяржавы, заснаванай на выключным дыктаце іх партыі. Аднак гэта не так. Спачатку яны дэкларавалі і часткова выконвалі на практыцы ідэю кааліцыі з блізкімі рэвалюцыйна-дэмакратычнымі партыямі. Галоўным саюзнікам бальшавікоў і партнёрам па ўрадавай кааліцыі сталі левыя эсэры. Супрацоўніцтва дзвюх партый скончылася пасля заключэння Брэсцкага міру. Левыя эсэры рашуча выступалі супраць замірэння з кайзераўскай Германіяй і перайшлі ў апазіцыю. Яны імкліва набіралі палітычную вагу ў краіне, у тым ліку на неакупаванай тэрыторыі Беларусі. Падзеі 6 ліпеня 1918 года, вядомыя як «леваэсэраўскі мяцеж», выклікалі маштабныя рэпрэсіі з боку кіруючай партыі супраць нядаўніх паплечнікаў. Па краіне пракацілася хваля леваэсэраўскіх выступленняў. Да іх звычайна адносяць і ўзброеныя сутыкненні ў Оршы і Сянно ў жніўні 1918 года. Здавалася, гэты эпізод айчыннай гісторыі стаў хрэстаматыйным. Тым не менш тут пакуль больш пытанняў, чым адказаў. Архіўныя дакументы і супастаўленне розных версій таго, што адбылося амаль сто гадоў таму, даюць магчымасць дакладна аднавіць карціну тых драматычных падзей.

**Карэнны пералом**

Забойства левымі эсэрамі ў Маскве германскага пасла графа В. Мірбаха 6 ліпеня 1918 года і наступныя падзеі, вядомыя як «леваэсэраўскі мяцеж», адыгралі важную ролю ў гісторыі рэвалюцыйнай Расіі. Яны канчаткова разарвалі адносіны паміж бальшавікамі і левымі эсэрамі. 15 ліпеня 1918 года Усерасійскі ЦВК прыняў рэзалюцыю пра абмежаванне доступу прадстаўнікоў партыі левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПЛСР) у Саветы ўсіх узроўняў *[1, с. 36].* Гэтае супрацьстаянне не толькі адбілася на ўнутранай сітуацыі ў краіне, але аказала ўплыў на ўспрыняцце бальшавісцкага рэжыму сусветнай супольнасцю. Галандскі даследчык Б. Наардэн адзначае, што менавіта на 1918 год прыпаў пік негатыўнага стаўлення еўрапейцаў да Расіі, і не апошнюю ролю тут адыграў разгром бальшавікамі сваіх палітычных апанентаў *[2, p. 295–296].* У савецкай, а таксама ў сучаснай беларускай, расійскай і заходняй гістарыяграфіі існуе вялікі спектр меркаванняў у дачыненні да прычын, абставін і наступстваў «леваэсэраўскага мяцяжу» 6–7 ліпеня 1918 года. Адны гісторыкі сцвярджаюць, што левыя эсэры мелі намер забіць У. І. Леніна і іншых савецкіх кіраўнікоў *[3, с. 240].* Некаторыя аўтары лічаць, што ў гэтыя дні ўвогуле мела месца правакацыя бальшавікоў, а менавіта ВЧК, якая «падставіла» левых эсэраў *[4, с. 5, 235–240].* Неабходна прыняць пад увагу і погляд тых даследчыкаў, якія ацэньваюць ліпеньскую сітуацыю як непрадуманую спробу кіраўніцтва ПЛСР ажыццявіць антыўрадавае выступленне, што і выкарысталі бальшавікі ў сваіх палітычных мэтах *[5; 6; 7].* Частка навукоўцаў працягвае адстойваць пункт гледжання пра загадзя падрыхтаваны антысавецкі мяцеж *[8, с. 66–77].*

Падзеі ліпеня 1918 годзе ў Маскве мелі рэзананс і ў рэгіёнах. Не была выключэннем Заходняя вобласць РСФСР, у склад якой уваходзілі Смаленская і неакупаваныя германскімі войскамі часткі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Звесткі пра забойства графа В. Мірбаха і мяцеж у Маскве прыйшлі ў Заходнюю вобласць 6–7 ліпеня, у суботу і нядзелю, а ўжо 8 ліпеня Аблвыкамзах распаўсюдзіў зварот «Да насельніцтва Заходняй вобласці і горада Смаленска», у якім ішла гаворка аб правакацыі ў Маскве «банды белагвардзейцаў, што прыкрываліся імем левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў». У той жа дзень на пасяджэнні Аблвыкамзаха яго старшыня і лідар Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РКП(б) А.Ф. Мяснікоў заявіў, што выступленне левых эсэраў «гэта нават не бунтарства, а проста палітычнае свавольства, і яно ліквідавана». Ён прыйшоў да высновы: «Хто супраць бальшавікоў ідзе, ідзе і супраць Саветаў, цяпер гэта аналагічна» *[9].* Тактыка кіраўніцтва Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) была накіравана на падаўленне леваэсэраўскіх арганізацый на тэрыторыі Заходняй вобласці *[10].* У значнай ступені гэта лінія тлумачылася той пагрозай, якую ўяўлялі левыя эсэры панаванню бальшавікоў, выступаючы ў якасці ўплывовай апазіцыйнай сілы. Калі бальшавікоў у Заходняй вобласці ў чэрвені 1918 года налічвалася 2906 чалавек, то Заходняя абласная арганізацыя ПЛСР мела прыблізна такую ж колькасць. Напрыклад, у красавіку 1918 года членаў ПЛСР у Віцебскай губерні было больш за 300, а ў Смаленскай – 640 чалавек. Эсэраўскія арганізацыі мелі трывалую тэндэнцыю да росту. У чэрвені 1918 года адных толькі леваэсэраўскіх агітатараў у Беларусі налічвалася каля 2 тыс. чалавек *[11, с. 673; 12, с. 176].* Даволі значным было прадстаўніцтва левых эсэраў у савецкіх органах. Паводле даных акадэміка І. М. Ігнаценкі, з 745 дэлегатаў павятовых з’ездаў Саветаў Гарадоцкага, Полацкага, Аршанскага, Чэрыкаўскага і Быхаўскага паветаў бальшавікоў налічвалася 237 чалавек (31,8 %), а левых эсэраў – 358 (48 %). У выканкамах левыя эсэры мелі наступнае прадстаўніцтва: у Чэрыкаўскім – 58 %, Горацкім – 58 %, Сенненскім – 50 %, Полацкім – 46 %, Гарадоцкім – 40 %, Быхаўскім – разам з беспартыйнымі 54 %. У Магілёўскім губернскім выканкаме

леваэсэраўская фракцыя складала 40 %, а разам з правымі эсэрамі і меншавікамі – 51 % *[13, с. 144–145].* У ліпені 1918 года Заходняя арганізацыя ПЛСР апынулася ў цяжкім становішчы. Яе лідары не мелі дакладнай інфармацыі аб падзеях у Маскве, тым больш яны не рыхтавалі ніякіх выступленняў. 8 ліпеня 1918 года фракцыя левых эсэраў і максімалістаў Магілёўскага губвыканкама пастанавіла лічыць забойства графа В. Мірбаха «несвоечасовым» і прызнала замах на савецкую ўладу антырэвалюцыйным дзеяннем. «Калі суд пацвердзіць віну ЦК супраць Савецкай улады, – гаварылася ў рэзалюцыі, якая была прынята адзінагалосна, – то фракцыя левых эсэраў прызнае такое рашэнне правільным і следам за такім ЦК партыя левых эсэраў не пойдзе» *[14].*



**Кадр з кінафільма «Шостае ліпеня».**

22 ліпеня на пасяджэнні Аблвыкамзаха бальшавікі, у адпаведнасці з інструкцыяй народнага камісара ўнутраных спраў РСФСР Р. І. Пятроўскага, паставілі перад фракцыяй левых эсэраў пытанне аб адносінах да ЦК ПЛСР. У адказ члены фракцыі асудзілі забойства В. Мірбаха, але заявілі: «...партыя левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў пайшла ў Саветы не для таго, каб падрываць рабоча-сялянскую ўладу, а каб падтрымаць і ўмацаваць гэтую ўладу ўсімі сіламі, і ні пры якіх абставінах ПЛСР з Саветаў не выйдзе» *[15].* Гэтая заява цалкам адпавядала партыйнай тактыцы, зацверджанай ЦК ПЛСР 24 чэрвеня 1918 года, калі было прынята рашэнне пра забойства графа В. Мірбаха. У пастанове ЦК, у прыватнасці, гаварылася: «Мы разглядаем свае дзеянні як барацьбу супраць цяперашняй палітыкі Савета Народных Камісараў і ні ў якім разе як барацьбу супраць бальшавікоў» *[16, с. 186].* Толькі два члены фракцыі асудзілі дзеянні свайго ЦК. Астатніх жа 13 левых эсэраў выключылі са складу Аблвыкамзаха *[15].*

Ніякага ўзброенага супраціўлення з боку ПЛСР не назіралася. Без бою здаліся баявыя дружыны левых эсэраў у Заходняй вобласці. 9 ліпеня 1918 года Віцебская баявая дружына разарвала сувязі са «здрадніцкай партыяй» і ўвайшла ў склад рэгулярных фарміраванняў Чырвонай арміі. 11 ліпеня па рашэнні Полацкага павятовага Савета была раззброена мясцовая леваэсэраўская баявая дружына. Мерапрыемствы, накіраваныя фактычна на развал леваэсэраўскіх партыйных арганізацый, усюды праходзілі амаль што без эксцэсаў. 14 ліпеня 1918 года быў арыштаваны ўвесь склад Віцебскага губернскага камітэта ПЛСР. Гэта акцыя афіцыйна тлумачылася падазрэннем у спробе накіраваць частку леваэсэраўскіх сіл у Маскву для падтрымкі ЦК і аховы фракцыі ПЛСР на 5-м Усерасійскім з’ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх і казацкіх дэпутатаў.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на разгорнутыя супраць ПЛСР рэпрэсіі з боку ўлад Заходняй вобласці, левыя эсэры захавалі пэўныя прапагандысцкія і арганізацыйныя магчымасці. Так, у першай палове ліпеня 1918 года група левых эсэраў Магілёўскага губвыканкама на чале са старшынёй В.С. Селіванавым выехала ў Мсціслаўскі, Чавускі і Горацкі паветы, дзе на сялянскіх сходах тлумачыла палітыку сваёй партыі *[17, с. 134, 138–139, 155–156, 163–164; 18, с. 83].*

Да пачатку жніўня 1918 года ў Оршы, які ў большасці паветаў Заходняй вобласці, левыя эсэры былі пазбаўлены ўлады. 22 ліпеня на пасяджэнні Аршанскага выканкама фракцыя левых эсэраў выказала гатоўнасць асудзіць свой ЦК, але старшыня І. І. Буевіч у сваёй прамове здолеў пераламаць сітуацыю і абвінаваціў бальшавікоў у здрадзе ідэалам рэвалюцыі. Яго падтрымаў левы эсэр Быкаў. Бальшавікі патрабавалі ад фракцыі ПЛСР выключыць абодвух з выканкама, але атрымалі адмову. Паводле звестак газеты «Известия Облискомзапа», левыя эсэры пакінулі выканкам у знак пратэсту *[19].* Але член Аршанскага выканкама ад партыі бальшавікоў М. С. Ігнацьеў сцвярджаў, што «ўзнікла неабходнасць выгнання эсэраў з Савета», і «бальшавікамі большасцю галасоў было прынята рашэнне аб выключэнні эсэраў з выканкама» *[20].* 17 бальшавікоў, што засталіся ў складзе Аршанскага выканкама, устанавілі кантроль над дзейнасцю гэтага савецкага органа і абралі яго старшынёй свайго прадстаўніка Л. Рашаля.

Левыя эсэры разгарнулі агітацыю, спрабуючы данесці да насельніцтва свае погляды на перспектывы рэвалюцыйнага руху. Менавіта ў час такой агітацыі органы ЧК арыштавалі І. Буевіча і яшчэ двух членаў партыі.



**Прэзідыум выканкама Аршанскага павятовага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (верасень 1918 года). На здымку (злева направа): Вайнбург, Е. Тумарынсон, М. Ігнацьеў (старшыня), Т. Жалезнякоў, В. Каралёў, Масюта (сакратар).**

**Нечаканыя паўстанні**

І вось пасля шэрагу ўдалых для бальшавікоў мерапрыемстваў супраць ПЛСР у Заходняй вобласці, праз месяц пасля маскоўскага выступлення, у Оршы і Сянно раптоўна выбухнулі два «леваэсэраўскія мяцяжы». У акадэмічнай «Гісторыі Беларускай ССР» сцвярджаецца, што «мяцеж у Маскве з'явіўся сігналам для эсэраўскіх выступленняў і ў іншых месцах», асобна вылучаюцца паўстанні ў Оршы і Сянно як найбольш буйныя і небяспечныя. Чэкісты адносілі падаўленне Аршанскага паўстання да адной з найбольш цяжкіх аперацый, якія ім давялося выконваць за ўвесь 1918 год *[21, с. 103; 22, с. 173]*.

Погляд на Аршанскае і Сенненскае паўстанні як на адны з буйных антыбальшавіцкіх выступленняў, падрыхтаваных левымі эсэрамі, не змяніўся і да нашых дзён. Менавіта так яны трактуюцца ў прадмове да грунтоўнага выдання дакументаў ПЛСР *[11, с. 31]*. Некаторыя беларускія даследчыкі, хоць і мяняюць негатыўную ацэнку на больш памяркоўную, фактычна прытрымліваюцца старых падыходаў, сцвярджаючы, што Аршанскае паўстанне 1918 года было «найбуйнейшым у ланцугу леваэсэраўскіх мяцяжоў 1918 года» і «паўстанцы выступілі супраць улады Саветаў» *[23; 24, с. 536]*. Варта таксама адзначыць, што ў навуковай літаратуры, як савецкай, так і сучаснай, у дачыненні да падзей у Оршы і Сянно ўжываюцца дзве назвы: мяцеж і паўстанне.

Такі падыход да падзей у Оршы і Сянно ў жніўні 1918 года заснаваны пераважна на ўспамінах удзельнікаў падаўлення паўстанняў, сабраных у 1923 годзе ў зборніку «Красная быль» *[25]*. У далейшым матэрыялы зборніка падмацоўваліся некаторымі мемуарнымі і архіўнымі звесткамі. Атрымалася версія, якая найбольш поўна выкладзена савецкім гісторыкам С. З. Пачаніным *[26, с. 221–234; 27]*. Скарочана яна выглядае наступным чынам. На пачатку жніўня 1918 года ў чырвонаармейскія часці, размешчаныя ў Оршы, паступае загад аб перадыслакацыі на Усходні фронт для барацьбы супраць чэхаславацкага корпуса і войскаў Камуча (Камітэта членаў Устаноўчага сходу). Да гэтага часу Аршанскі гарнізон быў распрапагандаваны левымі эсэрамі, а на чале некаторых часцей, напрыклад Невельскага палка 1-й Магілёўскай дывізіі, стаялі левыя эсэры. 5 жніўня мясцовая арганізацыя ПЛСР збірае гарнізонны сход, на якім прымаюцца рэзалюцыі аб роспуску Аршанскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Уся ўлада перадаецца створанаму тут жа рэвалюцыйнаму камітэту на чале з левымі эсэрамі І. І. Буевічам, І. В. Петражыцкім. У той жа дзень мясцовыя бальшавікі выклікаюць з Віцебска невялікі атрад чырвонаармейцаў з двума браневікамі, але мяцежнікі разбіваюць іх, захопліваюць увесь горад і рыхтуюцца да абароны: капаюць акопы, валяць дрэвы, размяшчаюць на подступах да горада артылерыйскія батарэі. Пачынаюцца рэпрэсіі супраць бальшавікоў і работнікаў савецкіх органаў. На ліквідацыю мяцяжу з Віцебска і Смаленска накіроўваюцца атрады на чале з С. М. Крыловым і І. А. Адамовічам адпаведна. Перадавой групай чэкістаў камандаваў В. Даўбэ. Вельмі хутка мяцежнікаў удалося раззброіць дзякуючы нібыта смелым дзеянням чэкістаў. Пры гэтым падаўленне паўстання адбылося амаль што без стральбы і ахвяр. Дзіўны мяцеж! Ён падасца яшчэ больш дзіўным, калі ўзгадаць, што ні адзін з яго «кіраўнікоў» не панёс сур'ёзнага пакарання. І. І. Буевіч у далейшым займаў адказныя савецкія і гаспадарчыя пасады *[23, с. 117]*. А мяцежныя Невельскі, Аршанскі і 1-ы Беларускі конны палкі былі накіраваны на Усходні фронт, быццам і не было ніякага выступлення.

Далей падзеі разгортваліся вакол г. Сянно. Тут на чале «паўстання», паводле версіі савецкіх гісторыкаў, стаялі старшыня Сенненскага павятовага выканкама Я. Закрэўскі, левы эсэр, які толькі што вярнуўся з 5-га Усерасійскага з'езда Саветаў, С. Будкевіч (Буткевіч), сакратар

выканкама, таксама левы эсэр і Д. Ф. Прышчэпаў (у С. Пачаніна – С. Прышчэпаў), камандзір Сенненскага палка, якога вышэйшае камандаванне збіралася змяніць за нездавальняючую палітычную працу. Мяцежнікі нібыта мелі намер прыйсці на дапамогу сваім аршанскім паплечнікам, для чаго войскі Сенненскага палка 8 жніўня пакінулі дэмаркацыйную лінію. Ужо 9 жніўня ўсё той жа В. Даўбэ з невялікім атрадам прыбыў у Сянно, але спроба ўціхамірыць «паўстанне» не ўдалася. Завязаўся бой, бальшавікі хутка адступілі. 11 жніўня 1918 года ў Сянно ўступіў 1-ы Латышскі кавалерыйскі полк, аднак горад быў пусты, бо часці Сенненскага і Стайкаўскага палкоў, да якіх далучыліся нібыта «сотні кулацкіх элементаў», прыхапіўшы павятовую казну, перайшлі дэмаркацыйную лінію і выбілі немцаў з шэрагу вёсак. Сенненцам не ўдалося замацавацца «на тым баку», бо немцы перакінулі новыя войскі і вымусілі «мяцежнікаў» вярнуцца на савецкую тэрыторыю, дзе яны і разышліся па лясах.

С. Пачанін расцэньваў «Сенненскае паўстанне» як спробу «справакаваць вайну з Германіяй» *[26, с. 234]*. Але і тут узнікаюць пытанні. Чаму сенненцы, якія нібыта збіраліся дапамагчы аршанскаму выступленню, заставаліся ў Сянно? Чаму два мяцежныя палкі, якія колькасна перавышалі накіраваныя супраць іх атрады, адступілі? Калі мэтай сенненскай леваэсэраўскай арганізацыі з самага пачатку быў менавіта зрыў міру з Германіяй, то чаму яны перайшлі дэмаркацыйную лінію толькі пад націскам чырвонаармейскіх і чэкісцкіх фарміраванняў? Чаму Д. Прышчэпаў, абʼяўлены па-за законам, у будучым стаў адным з кіраўнікоў БССР, наркамам земляробства? Нарэшце, агульнае для аршанскага і сенненскага выступленняў пытанне: на што разлічвалі мясцовыя левыя эсэры, для чаго паднялі «мяцеж» у такі нязручны момант, калі бальшавікі фактычна дэзарганізавалі працу ПЛСР, арыштаваўшы яе цэнтральнае кіраўніцтва, раззброілі баявыя дружыны левых эсэраў, распусцілі альбо паставілі пад свой поўны кантроль рэгіянальныя арганізацыі партыі? Неабходна разгледзець сітуацыю ў Оршы і Сянно ў жніўні 1918 года яшчэ раз і больш уважліва.

**Дакументы пральваюць святло**

24 ліпеня 1918 года Вышэйшы Ваенны Савет Рэспублікі выдаў загад аб адпраўцы вайсковых часцей, што знаходзіліся ў Аршанскім і Сенненскім паветах, на Усходні фронт *[17, с. 164]*. Пра наступныя падзеі мы можам зрабіць высновы, абапіраючыся на пастанову Камісіі па расследаванні падзей, што адбыліся ў горадзе Оршы 6–7 жніўня ад 21 жніўня 1918 года, і прыгавор Гомельскага губрэўтрыбунала ад 7–9 жніўня 1919 года па справе аб абвінавачанні шэрагу грамадзян у «леваэсэраўскім паўстанні» ў горадзе Оршы, што захаваліся ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Чамусьці раней яны не выкарыстоўваліся даследчыкамі. Хоць менавіта гэтыя дакументы павінны стаць падмуркам для навуковага аналізу таго, што адбывалася ў двух паветах паўночна-ўсходняй Беларусі ў жніўні 1918 года.

Архіўныя крыніцы даюць падставу сцвярджаць, што не было ніякага загавору левых эсэраў. Выступленне чырвонаармейцаў у Оршы насіла стыхійны характар. Байцы адмовіліся пакінуць дэмаркацыйную лінію і накіравацца на Усходні фронт. Следчая камісія патлумачыла такія паводзіны наступнымі прычынамі: 1) часці Магілёўскай дывізіі, што знаходзіліся на дэмаркацыйнай лініі, асабліва 2-і Аршанскі полк, займаліся хабарніцтвам, паборамі і кантрабандай і не жадалі пазбаўляцца сваіх прыбыткаў; 2) большасць байцоў Аршанскага гарнізона паходзіла з акупаванай немцамі ці памежнай тэрыторыі і негатыўна ставілася да наступстваў Брэсцкага міру; 3) ажыццяўленне дэкрэта аб аддзяленні царквы ад дзяржавы выклікала негатыўную рэакцыю сярод жыхароў Оршы і паспрыяла распаўсюджванню антысеміцкіх і пагромных настрояў. Прызначэнне кіраўніком павета яўрэя Л. Рашаля, вядома, толькі распаліла пагромшчыкаў. Пры гэтым сапраўды праводзілася антыбальшавіцкая прапаганда за зрыў Брэсцкага міру, але выявіць, хто яе праводзіў, не ўдалося. Былі высветлены толькі два прозвішчы: Бароўскі, камандзір 2-га Аршанскага палка, і Гаршкоў, палітычны камісар гэтага ж палка. Аднак іх прыналежнасць да ПЛСР камісія пацвердзіць не змагла і запісала, што яны толькі «называлі сябе левымі эсэрамі» і «прыкрываліся імем левых эсэраў» *[28, л. 53–54]*.

У Оршу выехалі А. Ф. Мяснікоў і член Усерасійскага ЦВК Дзмітрыеў (верагодна, Я. П. Дзмітрыеў – у будучым старшыня Вярхоўнага суда і наркам юстыцыі РСФСР, адзін з арганізатараў масавых рэпрэсій у 1937–1940 гадах). Яны спрабавалі пераканаць полк падпарадкавацца загаду вышэйшага камандавання, але беспаспяхова. Цікава, што ў той час, як разгортваліся гэтыя падзеі, агульны сход камуністаў 1-га рэвалюцыйнага пяхотнага палка Аршанскага савета накіраваў атрад з 20 чалавек у Горацкі павет «для барацьбы з левымі эсэрамі» *[17, с. 163–164]*. Гэта значыць, што мясцовыя бальшавікі не надта асцерагаліся аршанскіх левых эсэраў.

Кіраўніцтва Аршанскай арганізацыі ПЛСР не толькі не натхняла мяцежнікаў, але, наадварот, усялякімі сродкамі спрабавала вырашыць канфлікт, падтрымлівала сувязь з бальшавікамі і савецкімі органамі як на месцы, так і ў Віцебску. І. Петражыцкі, які змяніў арыштаванага І. Буевіча на пасадзе кіраўніка павятовай арганізацыі ПЛСР, быў «вышуканы натоўпам салдат і прымушаны да старшынства» на мітынгу чырвонаармейцаў 5 жніўня 1918 года. Падчас гэтага мітынгу І. Петражыцкі і А. М. Кражда, таксама левы эсэр, літаральна выратавалі старшыню Аршанскага райкама РКП(б) В. С. Брука ад расправы з боку чырвонаармейцаў. Потым,

калі мяцежнікі ўтварылі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт – орган кіравання сваім рухам, яны паставілі на яго чале І. Буевіча, якога вызвалілі з турмы. Але апошні, падкрэслівае следчая камісія, на гэтай пасадзе ставіў за мэту «падтрымку парадку, прадухіленне пагромаў, поўную згоду з арганізацыяй камуністаў, падпарадкаванне цэнтральнай Савецкай уладзе». У гэтай справе яму дапамагалі І. Петражыцкі і Вульфус, які рэдагаваў «Бюллетень ВРК», друкаваны орган паўстання. У паўстанцкім Ваенна-рэвалюцыйным камітэце група левых эсэраў супрацьстаяла Г. І. Русеніну-Паплаўскаму, які прыбыў з Саратава і знаходзіўся ў турме за антысавецкую прапаганду, і А. Беленькаму, арыштаванаму напярэдадні за спекуляцыю. Абодва былі вызвалены з турмы разам з іншымі зняволенымі. Менавіта яны заклікалі да расправы з бальшавікамі, найперш чэкістамі, настойвалі на арганізацыі абароны горада. І. Буевіч здолеў узяць сітуацыю пад поўны кантроль. «Задушэнне» мяцяжу – цалкам яго заслуга, а не нейкіх ліхіх налётаў чэкістаў. Увесь час паўстання ён падтрымліваў сувязь з Віцебскам, сам сустрэў атрад, накіраваны губернскімі органамі для падаўлення паўстання, на падыходзе да горада. Дарэчы, камандзір віцебскага атрада С. Крылоў заявіў, што мае намер прайсці па Оршы з музыкай. Разам з С. Крыловым прыехалі і бальшавікі, члены Аршанскага выканкама, якія ўцяклі з горада на пачатку паўстання. Праз некаторы час І. Буевіч прывёз С. Крылову загад аб самароспуску паўстанцкага ВРК і загадаў Аршанскаму гарнізону свабодна прапусціць савецкія войскі. Член ПЛСР Мацкевіч меў поўнае права заявіць праз некалькі дзён пасля гэтых падзей на Аршанскім павятовым з'ездзе Саветаў: «Бальшавікі разбегліся, і горад застаўся без улады, мы ўзялі ўладу ў свае рукі, каб прадухіліць пагром» *[28, л. 55, 58–59, 61]*.



**А. Н. Пазняк – камандзір (справа) і Я.М. Зысман – камісар 1-га Аршанскага палка.**

Неабходна ўдакладніць звесткі наконт узброеных сутыкненняў у час Аршанскага паўстання. Галоўны і фактычна адзіны бой адбыўся на мосце цераз Днепр 6 жніўня, у самым пачатку выступлення. Раніцай 6 жніўня чырвонаармейцы 2-га Аршанскага палка і 2-й роты 1-га Аршанскага палка накіраваліся ў цэнтр горада, каб правесці там мітынг і нібыта арыштаваць выканкам. На мосце іх сустрэў бранявік і атрад колькасцю 135 узброеных бальшавікоў і чэкістаў. Следчая камісія некалькі разоў спыняецца на тым, як камандзір 2-га Аршанскага палка Бароўскі выйшаў наперад, узняў рэвальвер і стрэліў у бок браневіка, адкуль яму махалі рукой, каб ён спыніўся. І толькі пасля гэтага з боку камуністычнага атрада быў адкрыты агонь, але мяцежнікаў аказалася больш, і атрад адступіў *[28, л. 56–57, 60]*. М. Ігнацьеў рыху інакш апісвае гэты момант: «Маючы на ўвазе непазбежнасць эсэраўскага мяцяжу, камітэт РКП(б) яшчэ напярэдадні даручыў кіраўніцтва падаўленнем паўстання старшыні выканаўчага камітэта Л. Рашалю, намесніку старшыні Надзвычайнай камісіі Крывашэеву і мне (у той час я працаваў старшынёй павятовага рэўтрыбунала). Ледзь толькі роты мяцежнікаў, якія ішлі ў галоўнай калоне, узышлі на мост, з браневіка быў адкрыты кулямётны і гарматны агонь, падтрыманы ружэйным агнём камуністычнага атрада» *[20]*. Апошняя версія больш падобная да праўды, бо надта ўжо нелагічна выглядаюць дзеянні камандзіра палка, чалавека ваеннага, які з рэвальвера страляе па бранiраванай машыне, быццам спецыяльна для таго, каб даць падставу адкрыць агонь у адказ. Нарэшце, якія ж рэпрэсіі былі супраць бальшавікоў у час аршанскага выступлення? Ні адзін член РКП(б) 5–7 жніўня 1918 года ў Оршы не быў забіты альбо сур'ёзна паранены. Мяцежнікі арыштавалі камандзіра 1-га Аршанскага палка камуніста А. Н. Пазняка, які знаходзіўся ў шпіталі, але ахоўваць яго паставілі таксама камуніста, камандзіра 8-й роты гэтага ж палка Астроўскага, які і дапамог свайму начальніку

ўцячы з-пад варты. Мела месца спроба затрымаць начальніка міліцыі М. Зюсьмана, а таксама астатніх членаў штаба гарадской міліцыі, але арганізаваная мяцежнікамі засада не дала плёну, і яны разышліся па дамах *[28, л. 66; 29]*.

**Сенненскі вузел супярэчнасцей**

У Сенненскім павеце падзеі адбываліся інакш. Павятовы Савет, які складаўся пераважна з левых эсэраў, даўно ўжо раздражняў улады Заходняй вобласці. У маі 1918 года па ініцыятыве члена ЦК ПЛСР Е. М. Каца, які прыбыў у Сянно з Масквы, былі захоплены і расстраляны 5 нямецкіх салдат з мэтай сарваць Брэсцкі мір. Пасля такой авантурнай акцыі бальшавікі спрабавалі змяніць склад мясцовага Савета і выканкама, аднак сенненскі павятовы з'езд Саветаў зноў падтрымаў левых эсэраў і выказаў ім давер пры фарміраванні выканаўчага камітэта. Газета Сенненскага павета «Известия Исполкома» заставалася адзіным у Заходняй вобласці легальным друкаваным сродкам інфармацыі, непадкантрольным бальшавікам. Менавіта на старонках гэтай газеты з'явіўся зварот Заходняга абкама ПЛСР, сенненскага камітэта левых эсэраў і павятовага прафсаюза рабочых і служачых з асуджэннем як забойства В. Мірбаха, так і дзеянняў бальшавікоў супраць ЦК ПЛСР. Гэта выклікала вельмі рэзкую рэакцыю ў Смаленску. Газету называлі антысавецкай, параўновалі з кадэцкімі і белагвардзейскімі выданнямі *[17, с. 156; 30, с. 456; 31]*.

На фоне такога складанага становішча ў пачатку жніўня 1918 года ў Сенненскім і Стайкаўскім палках, прызначаных для адпраўкі на Усходні фронт, адбыліся стыхійныя хваляванні чырвонаармейцаў. Сітуацыю ў Сянно растлумачвае інфармацыйная зводка па Заходняй вобласці: «У горадзе Сянно Магілёўскай губерні Віцебскім Латышскім атрадам праведзена нападзенне на выканкам. Апошні прыняў меры да ўціхамірвання мяцяжу, але ўсе захады да пажаданага выніку не прывялі. Тады выканкам, што складаўся ў большасці з левых эсэраў, жадаючы абараніць насельніцтва ў далейшым ад сумных інцыдэнтаў, пастанавіў злажыць з сябе паўнамоцтвы і перадаць уладу мясцоваму партыйнаму камітэту бальшавікоў». У горадзе быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які пачаў арганізацыю па валасцях камбедаў, разагнаў старую рэдакцыю газеты і пачаў выпуск свайго друкаванага органа *[32, л. 32]*. Чэкіст В. Даўбэ ў сваіх успамінах узгадвае, што няўдалая спроба Латышскага атрада, які налічваў каля 70 чалавек, адразу захапіць Сянно прывяла да жорсткага бою, нават рукапашнай і чалавечых страт з абодвух бакоў. Праўда, ён сам вымушаны прызнаць, што пасля ўзброенай сутычкі сенненцы накіравалі ў Смаленск і Маскву тэлеграму, у якой патрабавалі спыніць «кровапралітную, братазабойчую бойню», якую пачалі бальшавікі *[33, с. 107]*.

Што тычыцца пераходу палкоў на акупаваную тэрыторыю і баёў з немцамі, то, сапраўды, Сенненскі і Стайкаўскі палкі адступілі на занятую немцамі тэрыторыю, але на тую яе нязначную частку, якую ў верасні 1918 года планавалася перадаць савецкаму боку і для вёсак якой у жніўні рыхтаваліся нават кадры міліцыі. Бальшавікі ж выкарысталі сітуацыю, як гэта было і ў Оршы, і «рэарганізавалі» павятовы выканкам, паставіўшы яго пад поўны свой кантроль адпаведна з інструкцыяй сакратара Паўночна-Заходняй арганізацыі РКП(б) І. Рэйнгольда ад 31 ліпеня 1918 года *[34, л. 14]*.

А якую ж ролю адыграў Д. Прышчэпаў у сенненскіх падзеях? Яго біёграф І. Акшэўскі ставіць пад сумненне версію С. Пачаніна пра ўдзел будучага наркама земляробства ў выступленні супраць савецкай улады *[35, с. 40–41]*. І зусім справядліва. Д. Прышчэпаў быў не толькі камандзірам Сенненскага палка, але і намеснікам фракцыі камуністаў (бальшавікоў) у павятовым выканкаме і на Сенненскім з'ездзе Саветаў. Д. Прышчэпаў літаральна закідваў Аблвыкамзах і Паўночна-Заходні камітэт РКП(б) тэлеграмамі са скаргамі на «засілле левых эсэраў у павеце», просьбамі «прыслаць добрых агітатараў» *[34, л. 1–4]*. У пачатку верасня 1918 года ЧК па Віцебскай губерні пасля разгляду справы аб падзеях у Сянно прызнала Д. Прышчэпава невінаватым і вызваліла яго з-пад варты.

Вышэйпрыведзеныя факты сведчаць, што ранейшыя сцверджанні гісторыкаў пра тое, быццам у Беларусі, а дакладней, на тэрыторыі Заходняй вобласці адбыліся мэтанакіраваныя «леваэсэраўскія мяцяжы», не маюць падстаў. Заходняя арганізацыя ПЛСР, губернскія і павятовыя камітэты левых эсэраў аказаліся не гатовы да барацьбы з бальшавікамі за ўладу пасля ліпеньскіх падзей 1918 года. Фактычна ўсе леваэсэраўскія структуры вобласці былі адрэзаны ад кіруючых цэнтраў сваёй партыі.

У Оршы і Сянно адбыліся стыхійныя выступленні чырвонаармейцаў, да якіх кіраўніцтва левых эсэраў не мела ніякага дачынення, а наадварот, імкнулася хутчэй нармалізаваць сітуацыю і актыўна супрацоўнічала ў гэтым пытанні з бальшавікамі. Паўстанцы з ліку байцоў Чырвонай арміі спрабавалі выкарыстаць лозунгі і назву партыі левых эсэраў, якая была вядома як найбольш апазіцыйная і адначасова савецкая. У выступленнях бралі ўдзел шараговыя члены ПЛСР, але іх роля абмяжоўвалася крытыкай палітыкі Саўнаркама.

Бальшавікі, не ўжываючы жорсткіх рэпрэсіўных мер супраць асобных удзельнікаў паўстання, зрабілі стаўку на арганізацыйны разгром леваэсэраўскіх структур. У выніку ўжо восенню 1918 года дзейнасць Заходняй арганізацыі левых эсэраў была поўнасцю паралізавана. ПЛСР

працягвала сваё існаванне на тэрыторыі вобласці, мела прадстаўніцтва ў Саветах, але сур'ёзна паўплываць на палітыку ў краі ўжо не магла.

**Вадзім ГІГІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**


**ЛІТАРАТУРА**

1. Декреты Советской власти: в 17 т. / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН СССР. – Т. 3. – М.: Госполитиздат, 1959.
2. Naarden, B. Socialist Europe and Revolutionary Russia: Reception and Prejudice 1848–1923 / B. Naarden. – Cambridge, 1992.
3. Хацкевич, А. Ф. Солдат великих боев: Жизнь и деятельность Ф. Э. Дзержинского / А. Ф. Хацкевич. – Минск, 1987.
4. Фельштинский, Ю. Г. Большевики и левые эсеры. Октябрь 1917 – июль 1918 / Ю. Г. Фельштинский. – Париж, 1985.
5. Овруцкий Л., Разгон А. Пасынки революции / Л. Овруцкий, А. Разгон // Родина. – 1990. – № 3.
6. Литвин, А. Л., Овруцкий, Л. М. Левые эсеры: программа и тактика (некоторые вопросы) / А. Л. Литвин, Л. М. Овруцкий. – Казань, 1992.
7. Hafner, L. The Assassination of Count Mirbach and the «July Uprising» jf the Left Socialist Revolutionaries in Moscow, 1918 / L. Hafner // Russian Review. – 1991. – Vol. 50. – № 2.
8. Гусев, К. В. Рыцари террора / К. В. Гусев. – М.: Луч, 1992.
9. К населению Западной области и города Смоленска // Известия Исполкома Советов Западной области и Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов (далее – «Известия Облискомзапа»). – 1918. – 9 июля; 14 июля.
10. Четвертая Западная областная конференция Российской Коммунистической партии (большевиков) // Звезда. – 1918. – 12 июня.
11. Партия левых социалистов-революционеров. Документы и материалы. 1917– 1925: в 3 т. – Т. 1: Июль 1917 г. – май 1918 г. / Сост., автор предисловия, введения и коммент. Я. В. Леонтьев. – М., 2000.
12. Малашко, А. М. К вопросу об оформлении однопартийной системы в СССР / А. М. Малашко. – Минск, 1969.
13. Ігнаценка, І. М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі / І. М. Ігнаценка. – Мінск, 1995.
14. Хроника // Известия Облискомзапа. – 1918. – 24 июля.
15. Заседание Областного Исполнительного Комитета // Известия Облискомзапа. – 1918. – 26 июля.
16. Красная книга ВЧК: в 2 т. – Т. 1. – М., 1990.
17. Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918–1920 гг.: сб. документов и материалов: в 2 т. – Т. 1 (февраль 1918 г. – февраль 1919 г.). – Минск, 1968.
18. История рабочего класса Белорусской ССР: в 4 т. – Т. 2: Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917–1937). – Минск, 1985.
19. Ушли от революции // Известия Облискомзапа. – 1918. – 28 июля.
20. Ігнацьеў, М. Пад сцягам Кастрычніка / М. Ігнацьеў // Ленінскі прызыў (Орша). –1968. – 26 верасня.
21. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937). – Мінск, 1973.
22. Из истории Всероссийской чрезвычайной комиссии (1917–1922 гг.): сб. документов. – М., 1958.
23. Дзядзенка, З. Аршанскае й сеньненскае паўстаньні / З. Дзядзенка // Спадчына. – 1999. – № 4. – С. 108–117.
24. Стужынская, Н. І. Аршанскае паўстанне 1918 г. / Н.І. Стужынская // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 1. – Мінск, 1996.
25. Красная быль. Большевики в Витебске: сб. статей, воспоминаний и материалов / Под ред. С. Крылова. – Витебск, 1923.
26. Почанин, С. З. Историей обреченные / С. З. Почанин. – Минск, 1977.
27. Почанин, С. З. В грозовом восемнадцатом: большевистские организации Белоруссии в борьбе за власть Советов в 1918 г. / С.З. Почанин. – Минск, 1969.
28. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 60. – Воп. 3. – Спр. 805.
29. Гурэвіч, О. Камандзір Першага Аршанскага / О. Гурэвіч // Ленінскі прызыў (Орша). – 1967. – 20 кастрычніка.
30. Игнатенко, И. М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917–1918 гг.) / И. М. Игнатенко. – Минск, 1962.

31. Русина, Г. Под советским флагом (газеты Советские и «советские») / Г. Русина // Известия Облискомзапа. – 1918. – 30 июля.
32. НАРБ. – Фонд 59. – Воп. 1. – Спр. 4.
33. Бандарэвіч, В. В. Экскурсія да вытокаў Сянно: краязнаўчыя нарысы / В. В. Бандарэвіч. – Мінск, 2008.
34. НАРБ. – Фонд 59. – Воп. 1. – Спр. 5.
35. Акшевский, И. Он любил эту землю: повесть о наркоме / И. Акшевский. – Минск, 1991.